# Пра Карласа Марыгелу

*Часопіс «Разам!» No 8-9*

Марыгела. Гэта прозвішча наўрад ці нешта скажа шырокай грамадскасці. Аднак менавіта гэты чалавек з'яўляецца найбольш вядомым тэарэтыкам гарадской герылы. Ён распрацаваў і ўпершыню прымяніў на практыцы тое, што сёння з'яўляецца класічнымі, тактычнымі і стратэгічнымі хітрынкамі, якія выкарыстоўваюцца практычна ўсімі тэрарыстычнымі арганізацыямі ад IРА ці ЭТА па ХАМАС. Ужо толькі таму варта бліжэй пазнаёміцца з гэтай асобай.

Бразілія для большасці з'яўляецца краінай футбола і карнавалаў, аднак гэта толькі прывабныя рысы, якія павінны прыцягваць у краіну турыстаў. На самой справе, Бразілія — адна з бяднейшых краінаў Лацінскай Амерыкі з усімі неабходнымі атрыбутамі галечы. Беспрацоўе, інфляцыя, злачыннасць... Так было заўсёды. І з часоў калі жыў Марыгела, не шмат чаго змянілася. Футбол і карнавал — вось дзве рэчы, якія ведае сярэднястатыстычны грамадзянін света пра далёкую Бразілію. Футбол і карнавал — вось што цікавіць. Вось што паказваюць па тэлевізару. Астатняе? Ну а каму гэта цікава? На пачатку 60-х гадоў урад пад кіраўніцтвам Жао Гуларта спрабаваў вывесці краіну з перманентнага эканамічнага крызісу шляхам даволі памяркоўных рэформаў. Узмацненне сацыяльнай абароны найбяднейшых слаёў грамадзтва і павялічэнне падаткаў, перш за ўсё з замежных канцэрнаў, выклікала незадавальненне не толькі сярод бразільскага эстэблішмента, але і ў ЗША. Аднак нават гэтыя сціплыя крокі ў накірунку абмежавання ўлады замежнага капіталу, як аказалася, былі занадта радыкальнымі і небяспечнымі з пункту гледжання Дзярждэпа ЗША. У 1964 годзе адбылося тое, што заўжды адбывалася ў Лацінскай Амерыцы ў падобных сітуацыях. Вайсковы пераварот — усталяванне жорсткай дыктатуры — масавыя рэпрэсіі. Над усім гэтым лунаў сцяг абароны дэмакратыі і супрацьстаяння пагрозе ўсталявання ў Бразіліі камуністычнай дыктатуры.
Камуністам мог быць, з пункту гледжаня вайскоўцаў, кожны. «Абаронцы Айчыны» не мелі літасці нават для святароў. Вось што ўспамінала Маўрына Борхес да Сільверыя — адна з манахінь, арыштаваных за «падрыхтоўку рэвалюцыі»: «Калі мяне пачалі катаваць з дапамогай электрашока, дык я не змагла стрымаць крыку і плачу, але каты толькі смяяліся і казалі, што будуць катаваць і іншых святароў і манахінь, няхай толькі тыя патрапяць да іх.»

Тэорыя прэвентыўнага ўдара, які нібыта выратаваў краіну ад камуністычнага путчу, была выпрацавана прапагандысцкай машынай і з'яўлялася ў кожным выпадку, калі трэба было растлумачыць, чаму выкарыстоўваюцца такія жорсткія сродкі барацьбы супраць незадаволеных. Па-за межамі закона апынуліся ўсе, каго можна было падазраваць у нахабнасці мець сваё меркаванне. Былі забароненыя ўсе палітычныя партыі. Палітычныя апаненты рэжыму знаходзіліся ў турмах, эмігравалі, знікалі без следу... Карласу Марыгеле ў той час было ўжо 50. Ён быў камуністам. У Кампартыю Бразіліі ён уступіў яшчэ ў 30-я гады. Кожны ў Бразіліі бачыў, што краіна паволі, але ўпэўнена губляе сваю незалежнасць на карысць ЗША. Канцэрны, дзякуючы карупцыі, за грашы выкупілі найбольш даходныя галіны прамысловасці. Народу Бразіліі была адведзена роля таннай рабочай сілы. У такіх умовах найбольш радыкальная і бескампрамісная частка незалежніцкага супраціву хутка патрапіла пад уплыў камуністаў, якія дэкларавалі вырашэнне як сацыяльных, так і нацыянальных праблемаў. Незалежнасць, усеагульнае шчасце, агульны дабрабыт... Сярод тых хто распачаў барацьбу за гэта быў і малады Карлас Марыгела. Пакаленне Камінтэрну — так іх назавуць гісторыкі. Яны марылі пра рэвалюцыю і свабоду, а збудавалі канцлагер...

Аднак лацінаамерыканскім камуністам, акрамя палымянага Фідэля, прайсці ўвесь шлях камунізму ад апантанага ахвяры-змагара да бязлітаснага забойцы-ката не ўдалася. Яны засталіся ў гісторыі адданымі змагарамі-фанатыкамі, ахвяраваўшымі ўсяго сябе на алтар ідэі, бязмежна запаланіўшай іхняе жыццё.

Такім быў і Карлас Марыгела. Гады беглі. І так атрымоўвалася, што справа, якой аддадзены лепшыя гады, за якую загінулі ў турмах ці ад куляў «эскадронаў смерці» найлепшыя сябры так і заставалася прыгожай байкай. Краіна, здавалася, назаўжды ператваралася ў вялікі публічны дом, куды на час карнавалу, нібыта крумкачы, зляталіся, прагнучыя новых пачуццяў, заходнія багацеі... У фармальна незалежнай краіне ўсё адбывалася толькі са згоды Вашынгтона. Дзядзька Сэм актыўна ўмешваўся ў палітычную барацьбу ў краіне, інвестуючы ў «найбольш перспектыўных» палітыкаў, якія вярталі гэтыя ўклады пасля атрымання ўлады. Менавіта такім чынам амерыканскія кампаніі атрымалі найбольш даходныя і важныя галіны прамысловасці. А краіна такім чынам з кожнымі чарговымі выбарамі ўсё больш трапляла ў залежнасць. Аднак бедната не зразумела ці не захацела зразумець змагароў. Таварышы па партыі, яшчэ нядаўна разам з табой мроіўшыя пра цуд рэвалюцыі, па троху ператварыліся ў звыклых бюракратаў, гаворачых дзяжурныя фразы і былі цалкам задаволеныя статусам «непрымірымай апазіцыі», якая ні на што не мела ўплыву і была цалкам пазбаўлена шансаў уплываць на шлях, якім ідзе краіна. Здавалася, галоўнае адпавядаць ідэалагічным патрабаванням і паслухмяна ісці ў фарватары маскоўскай знешняй палітыкі. СССР, не гледзячы на ўсе палымяныя заявы прафесійных антыкамуністаў, у 60-е ўжо не вынашваў планаў міравой рэвалюцы і цалкам прызнаў Лацінскую Амерыку сферай інтарэсаў ЗША. Падтрымка камуністычных і незалежніцкіх рухаў мела месца, калі ідэалагічна дадзены рух цалкам задавальняў Маскву. Збройныя рухі падтрымліваліся толькі ў выключных сітуацыях. Калі ў Бразіліі адбыўся вайсковы пераварот і пачалося паляванне на актывістаў кампартыі, Карлас Марыгела патрабаваў ад партыйнага кіраўніцтва ўзяцца за зброю і такім чынам не толькі скарыстацца сваім правам на самаабарону, але і наблізіць рэвалюцыю. Аднак, згодна з патрабаваннямі КПСС, кампартыя Бразіліі адмовілася ад авантурызма, які ў Маскве атаясамлівалі са збройнай барацбой і ўсе свае сілы накіравала на прапаганду, якая павінна абудзіць народныя масы і стварыць умовы для рэвалюцыі. Сапраўды, ўмоваў для рэвалюцыі ў той час у Бразіліі не было і Марыгела гэта прызнаваў, аднак, як напіша ён у сваім «Дапаможніку...»: «Абавязак рэвалюцыянера — у любых умовах рабіць рэвалюцыю». Яго бескампрамісная пазіцыя прыйшлася не да спадобы дагматыкам з бразільскага ЦК. Яшчэ дзядуля Ленін зазначыў, што рэвалюцыя адбываецца тады, калі «вярхі — ня могуць, а нізы — ня хочуць», а тут прапануецца распачаць барацьбу не чакаючы такой сітуацыі. Ніхто з дагматыкаў не верыў, што збройная барацьба можа стаць штуршком да абуджэння масаў. ЦК схіляўся да мітынгаў, тонаў улётак і брашураў... Тым, хто хацеў сапраўды змагацца, хто не баяўся ўзяць зброю ў рукі, дапамагала толькі Куба. Фідэль, не гледзячы на ціск з боку СССР, да сярэдзіны 80-х актыўна падтрымліваў рэвалюцыйныя арганізацыі Лацінскай Амерыкі. Сёння дакладна вядома, што такая пазіцыя Кубы выклікала незадаволенасць у трымаючых ініцыятыву ў сусветным камуністычным руху «савецкіх таварышаў», аднак для кубінцаў, якія знаходзіліся ў эканамічнай і палітычнай блакадзе, такая падтрымка мела занадта вялікае значэнне, ды і Куба была занадта далёка ад мядзвежых абдымкаў савецкага брата, а аўтарытэт Кастра занадта вялікім, каб гэтая незадаволенасць прыняла формы нейкага ўмяшальніцтва ва ўнутранныя справы.

Аднак вернемся да Марыгелы. Яго спробы раскачаць партыю скончыліся так, як гэтага можна было чакаць. «За авантурызм, пастаянную крытыку партыі з левацкіх пазіцый і заклікі да збройнай барацьбы» Карлас Марыгела быў выключаны з кампартыі. Нельга

сказаць, каб ён вельмі турбаваўся. Канешне, было непрыемна, што партыя, якая была ўсё ж такі дастаткова моцнай сілай, так і застанецца ў бяздзеянні, аднак цяпер у яго былі развязаныя рукі. Ён адразу распачаў стварэнне сваёй арганізацыі. На прыканцы 1967 — пачатку 1968 года ім было ўтворана «Дзеянне за нацыянальнае вызваленне». Праграма была даволі простай — скінуць вайсковую дыктатуру і пасля гэтага ўтварыць незалежны рэвалюцыйны ўрад. Варта яшчэ раз падкрэсліць, што дадзеная арганізацыя ўтваралася ва ўмовах фашысцкай дыктатуры, калі нават за меншыя правіннасці людзей забівалі ці яны знікалі без следу. І калі дадаць да гэтага паляванне на ўсіх незадаволеных у якім удзельнічала ўся моц дзяржавы, дык само ўтварэнне падобнай арганізацыі ўжо з'яўляецца перамогай. Але толькі на ўтварэнні і дэклараванні патрэбы радыкальнай барацьбы Марыгела не спыніўся. Ён распрацаваў новую тактыку збройнай барацбы. Калі раней партызаны дзейнічалі пераважна ў сельскай мясцовасці, у джунглях ці гарах, ствараючы там асяродак супраціўлення, дык ён прапанаваў перанесці змаганне ў самае сэрца Сістэмы, у гарады. «Горад сёння з'яўляецца сэрцам сістэмы, цэнтрам арганізацыі палітычнай і эканамічнай эксплуатацыі. Адначасова гэта — самы слабы пункт сістэмы. Супрацьлегласці тут самыя вострыя, гэта арганізаваны хаас» — лічыў Марыгела. Менавіта сюды, у найбольш слабое месца Сістэмы, дзе вораг найменш падрыхтаваны да атакі і павінен ударыць гарадскі партызан. «Найпершая задача гарадскога партызана — дэмаралізаваць вайсковы рэжым і яго рэпрэсіўныя сілы, а таксама атакаваць і разбураць маёмасць замежных кампаній...» — лічыў Карлас Марыгела. На працягу 1968-1969 гадоў партызаны правялі шэраг збройных акцый. Гэта былі перш за ўсё — экспрапрыяцыі і напады на казармы, пастарункі паліцыі, турмы і г.д. Мабільныя групы парызанаў наводзілі жах на вайсковы рэжым, які яшчэ нядаўна, здаецца, цалкам апанаваў краіну. Быў забіты шэраг найбольш адыёзных фігураў ў сілавых структурах. Значныя страты былі нанесены і эканамічнай сістэме. Так партызаны экспрапрыявалі для патрэбаў барацьбы больш за мільён даляраў ЗША.
«Вайскоўцы і паліцыя бароняць урад, які народ ненавідзіць, партызаны ж дзейнічаюць у інтарэсах народу. Зброя паўстанцаў горшая чым у ворага, але з пункту гледжання маралі гарадскі партызан мае неаспрэчную перавагу. Гэтая маральная перавага падтрымлівае партызана. Дзякуючы гэтаму, гарадскі партызан можа выканаць свой першапачатковы абавязак — атакаваць і застацца жывым» — лічыў Марыгела.

Найбольш вядомай акцыяй партызанаў з «Дзеяння за нацыянальнае вызваленне» стала выкраданне амерыканскага пасла Чарльза Элбрыка. Урад ЗША націснуў на бразільскіх вайскоўцаў і тыя пагадзіліся выканаць патрабаванні партызанаў. Пасол быў абменены на 15 паўстанцаў, якія знаходзіліся ў турмах. Пасля гэтага цярпенне ЗША выразна скончылася. Бразільскія вайскоўцы прайшлі спецыяльную падрыхтоўку ў ЗША, дзе імі была распрацавана цэлая стратэгія барацьбы з партызанамі, якая ўключала ў сябе як вайсковыя, так і прапагандысцкія і нават пэўныя эканамічныя меры. Узброеныя новымі ведамі «бразільскія мяснікі» развярнулі паляванне на партызанаў. Карлас Марыгела адчуваў патрэбу асэнсаваць і давесці да людзей вопыт стварэння і дзейнасці збройных партызанскіх атрадаў ва ўмовах вайсковай дыктатуры. Ён напісаў цэлы шэраг артыкулаў і брашураў, якія ўнеслі значны ўклад у тэорыю рэвалюцыйнага руху. Найбольш вядомым з'яўляецца «Дапаможнік гарадскога партызана». «Дапаможнік падпісаны маім імем, таму што ідэі, выкладзеныя і сыстэматызаваныя тут, выражаюць асабісты досвед групы людзей, прыняўшых удзел ва ўзброенай барацьбе ў Бразіліі, сярод якіх я меў гонар быць. Неабходна адказваць за тое, што сказана і зроблена, таму ананімнасць робіцца праблемай ў такіх працах як гэта» — зазначана ўжо ва ўводзінах. Пасля з'яўлення гэтай невялічкай брашуры вайскоўцы больш не мелі сумненняў, хто з'яўляецца мазгавым цэнтрам «Дзеяння» і каго трэба ліквідаваць ў першую чаргу. Марыгела стаў мішэнню нумар 1 для вайсковай

дыктатуры.

4 лістапада 1969 года ў выніку спецаперацыі, праведзенай агентамі паліцыі, Карлас Марыгела загінуў.
З гэтага моманту мінула больш за 30 гадоў. Партызаны Бразіліі прайгралі сваю вайну. Аднак прайграла і дыктатура. Хто ж перамог? Ліберальны папулізм бразільскіх гарлахвацкіх на кожных выбарах абяцаючых і абяцаючых аднак нічога не змяняючых. Свет змяніўся. Няма больш СССР, а ЗША — адзіная імперыя. Сацыялізм у Бразіліі так і не пабудаваны. Капіталізм па-лацінаамерыканску і на далей не ў стане вырашыць праблемаў краіны. Таму штодзённасць — гэта бяспрацоўе, злачыннасць, наркотыкі і... футбол ды раз на год карнавал, у якім магчыма забыцца. Здаецца, тут ніколі нічога не зменіцца, аднак «абавязак рэвалюцыянера незалежна ад абставін, незалежна ад ідэалогій, рабіць рэвалюцыю». Так лічыў Карлас Марыгела.

**Заўвага.** Калектыў «Рэвалюцыйнае Дзеянне» не мае дачынення да аўтарству дадзенага матэрыялу.



*João Carlos Marighella*